мы бачым у актывізацыі музычна-выхаваўчай (і ўвогуле - мастац-кай) дзейнасці ў агульнаадукацыйных школах і ў падрыхтоўцы ад-паведных кадраў арганізатараў музычна-эстэтычнага выхавання, у прыватнасці, на факультэце Мастацкай творчасці Інстытута куль-туры.

## ДАМРОВАЕ ВЫКАНАЛЬНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЯГО РАЗВІЦЦЯ

Л.С.Таірава

Развіццё дамровага выканальніцтва ў Беларусі - гэта даволі складаны і супярэчлівы працэс, звязаны са шматлікімі фактарамі (эканамічнымі, палітычнымі, культурнымі), залежны ад аб'ектыў-ных і суб'ектыўных абставін. Так, забарона домры як інструмен-та заможнага (рускага) паходжання - характэрна не толькі для Беларусі. Аналагічная сітуацыя склалася таксама на Украіне, дзе змагаюцца за развіццё і распаўсюджванне нацыянальнай бандуры, супраць домры. Трэба таксама ўлічваць і тое, што домра ў нашай рэспубліцы знаходзіцца ў пастаяннай конкурснай барацьбе з такім эфектным і гучным інструментам як цымбалы.

Быў час, калі домру лічылі чыста аркестравым ці ансамблевым інструментам абмежаваных магчымасцей. І толькі зусім нядаўна па-чалося паспяховае ўзыходжанне домры на канцэртнай эстрадзе ў яка-сці саліруючага інструмента. У домры з'явілася нямала прыхільні-каў і аматараў, захопленых яе непаўторным, пявучым гукам, ба-гаццем тэхнічных і выяўленчых магчымасцей. Сённяшні бурны рост дамровага выканальніцтва на Беларусі абумоўлены шэрагам абставін:

- добрым станам беларускай айчыннай дамровай педагогікі, прычым на ўсіх узроўнях. Пачынаючы з ДМШ, педагогі-дамрысты ў большасці сваім працуюць добрасумленна на станоўчым прафесійным узроўні, шукаючы новыя, выразныя выяўленчыя магчымасці інструмен-та. Пры гэтым, прыток дзяцей на домру далёка не самы лепшы. Час-цей за ўсе сюды прыходзяць тыя, хто не паступіў на фартэпіана ці гітару;

- жыватворны ўплыў на ўсе народна-інструментальныя жанры, у тым ліку і на домру, аказваюць рэспубліканскія конкурсы імя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жыновіча, дзе ёсць выдатная магчымасць абмену мастацкім і тэхнічным вопытам паміж канкуруючымі інструменталістамі. Аналіз двух апошніх конкурсаў дазваляе зрабіць вывад аб няўхільным росце выканаўчага майстэрства дамрыстаў. Калі на I конкурсе першая прэмія нікому не была прысуджана (другую атрымаў Ю.Валіцкі), то на II – першая прэмія ўжо была рэалізавана. Яе атрымала А.Аўраменка;

– становучую ролю ў развіцці беларускай дамровай школы выконваюць дружбовыя культурныя сувязі з Расіяй, Украінай (творчыя сустрэчы, семінары, канферэнцыі і г.д.). Частыя гастролі такога адметнага музыканта, як А.Цыганкоў, яго творчасць, бліскучае выканаўчае майстэрства – таксама садзейнічалі развіццю домры ў Беларусі;

– агульныя намаганні нашай таленавітай творчай моладзі, такіх дамрыстаў, як Чарняк, С.Барэйка, У.Воранаў і інш. – стварылі добрыя ўмовы паступовага росту беларускага дамровага выканальніцтва. Асобная роля ў гэтым працэсе належыць салісту Белдзяржфілармоніі Мікалаю Марзікаму, які нядаўна заваяваў першую прэмію і званне лаўрэата I міжнароднага конкурсу "Кубак Поўначы" ў г.Чарапаўцэ. Сваім майстэрствам ён грунтоўна абагаціў выразныя магчымасці інструмента, значна пашырыў тэхнічны і асабліва фактурны дыяпазон дамрыстаў.

Такім чынам, дзякуючы поспехам айчыннай педагогікі і выканаўчаму майстэрству нашых музыкантаў, домра як бы выйшла па-за межы народна-інструментальнага жанра. Сення домру з поўным правам можна разглядаць як акадэмічны інструмент раўных магчымасцей з такімі класічнымі інструментамі як скрыпка, віяланчэль, гітара.

Разам з тым, у галіне дамровага выканальніцтва з'явілася небяспечная тэндэнцыя кадравага скарачэння, асабліва на пачатковых этапах. Усе цяжэй стала ажыццяўляць наборы па класу домры ў ДМШ (інструмент дзе-нідзе лічыцца непрыстижным).

Дужа дрэнна і тое, што ў апошні час адбываецца распад некаторых прафесійных і самадзейных калектываў дамрова-балалаечнага саставу. Звязана гэта перш за ўсе з эканамічнымі цяжкасцямі сённяшнега часу. Невыгадна стала палацам культуры трымаць такія калектывы, лепш аддаць свае культурныя тэрыторыі камерсантам. А развальваючы ці працуючы ў палову сілы прамысловыя прад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыемствы не могуць фінансаваць культурныя праграмы, як не могуць гэта рабіць толькі што ўзнікшыя і яшчэ слабыя камерцыйныя структуры. У гэтых складаных для ўсёй культуры ўмовах намеціўся ледзь прыкметны заняпад домры.

Акрамя таго, слабая рэклама, таксама канцэнтрацыя культурнага жыцця пераважна ў сталіцы і ў абласных цэнтрах не дазваляюць давадзіць да перыферыі апошнія дасягненні выканаўчага майстэрства дамрыстаў-прафесіяналаў.

На жаль сення мае месца валюнтарысцкі, сілавы нажым "зверху" некаторых палітыкаў у галіне культуры адносна далейшага развіцця домры. Яны імкнуцца забараніць, згарнуць яе распаўсюджванне на тэрыторыі Беларусі, як інструмент замежнага паходжання.

У выніку, багацейшы вопыт, назапашаны патэнцыял, усе дасягненні айчыннай дамровай школы аказаліся пад пагрозай знішчэння. Ёсць прыклады перахода дамрыстаў у іншыя (не музычныя) абсягі дзейнасці. З'явіліся і першыя беспрацоўныя сярод дамрыстаў. Усе гэтыя страты, праз некалькі гадоў могуць мець адчувальныя адмоўныя вынікі. І такое ў нашай культурнай гісторыі ўжо было.

На прыкладзе забароны і забыцця некалі любімай і папулярнай у Беларусі мандаліны, мы можам сведчыць як амаль што знік цэлы пласт музычнай культуры беларускага народа. Літаральна некалькі дзесяцігоддзяў назад на тэрыторыі Беларусі бытавалі шматлікія мандалінныя ансамблі і гэты прыгожы, пявучы інструмент у многіх сем'ях займаў даволі паважанае месца. Зараз дамрысты імкнуцца адрадзіць гэты забыты інструмент.

Невыпадкова ў мінулым годзе была створана Асацыяцыя беларускіх дамрыстаў і мандаліністаў, галоўная мэта якой – адраджэнне страчаных традыцый народна-інструментальнай культуры, развіццё і распаўсюджванне дамрова-мандаліннага мастацтва ў Беларусі.

У сучасны момант выхаванне дамрыстаў не можа быць вузкапрафесійным. Сапраўдны музыкант павінен валодаць не толькі сваім асноўным інструментам (домрай), але і ведаць блізкія ей мандаліну, банджо. Таму што, чым шырэй і разнастайней будуць нашы музычныя інтарэсы, тым больш багатымі мы будзем у духоўным плане.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ